Аўтар: Длугуканская Паліна Аляксееўна,
вучаніца X класа УА “Магілёўскі дзяржаўны абласны ліцэй №1”
(настаўнік – Люп Людміла Артураўна)

# ШТО ТАКОЕ АДЗІНСТВА?

“Што такое адзінства?” – на такую тэму далі нам заданне напісаць сачыненне. Пасля ўрокаў я вырашыла прайсціся, заадно і падумаць, паразважаць: пра што ж напісаць... У галаве ўсплывалі крылатыя выслоўі, прапанаваныя настаўнікам для роздуму: “Нам ёсць чым ганарыцца, нам ёсць што берагчы!”; “Як жыць, дык жыць для Беларусі!”; “Я Беларуссю даражу: я тут вучуся, я тут жыву”, – такія мудрыя і разам з тым простыя, зразумелыя кожнаму беларусу словы…

Надвор’е было добрае: залатая восень яшчэ больш аздобіла рознакаляровай лістотай цэнтр горада, гронкі рабіны гарэлі чырванню, ахапкі хрызантэм буялі ў вялізных вазонах. Люблю наш горад – сваю малую радзіму. Паволі я дайшла да плошчы Адзінства. Маю ўвагу прыцягнулі дзве постаці: дзяўчынка гадоў пяці і яе маці.

– Бе-ла-ру-сы – гэта мы! – весела падскокваючы на адной назе, прачытала малая па складах словы, складзеныя з вялікіх літар, што стаялі на плошчы Адзінства. Ёй было весела скакаць, цікава чытаць словы, куды большыя за яе, хавацца за імі, выглядаць з-за іх.

– Не стамілася яшчэ скакаць, Алеська-гарэза?

– Не, ніколечкі не стамілася. Матулечка, а я прачытала сама: “Беларусы – гэта мы”. Тут пра нас з табой напісана?

– Так, пра нас з табой. А яшчэ пра брацiка і сястрычку, пра тату, пра бабулю з дзядулем, пра нашых сяброў, суседзяў – адным словам, пра ўсіх добрых, працавітых, таленавітых і міралюбівых людзей, што жывуць у нашай краіне. Ты, дачушка, можаш ганарыцца тым, што жывеш у Беларусі.

– А я і ганаруся ўжо. Я вершык ведаю. Хочаш навучу цябе? Мы сёння ў дзіцячым садку вучылі: “Я краінай ганарусь: яе імя Бе-ла-русь!”.

– Вельмі добрыя словы. Я ўжо таксама вывучыла. Ну, нагулялася? Хадзем дадому.

– Хадзем. А можна мне беларускі сцяжок купіць у кіёску?

– Можна, шчабятушка, – малая ўсё яшчэ нешта весела шчабятала, падскоквала, радасна размахвала чырвона-зялёным сцяжком.

Я з усмешкай глядзела ім услед. Можа, дзяўчынка не ведае ўсёй глыбіні прачытаных або завучаных слоў, але яна такая мілая, непасрэдная, добрая… Гарэзлівая будучыня… Маленькая беларусачка…

Тым часам да прыпынку падышлі замежныя студэнты. Яны глядзелі ў электоронны дадатак-навігатар, у карту ў тэлефоне. Адзін з іх прачытаў уголас з акцэнтам: “Плошча Адзінства”.

– Выбайчайце. Што ёсць “адзінства”? – спыталі яны мяне.

Я ахвотна расказала студэнтам-падарожнікам пра ўзнікненне плошчы і памятнага знака на ёй, пра ўз’яднанне беларускага народа сямнаццатага верасня тысяча дзевяцьсот трыццаць дзявятага года, пра бязвінныя ахвяры Вялікай Айчыннай вайны і генацыд, пра тое, як неабходна было аб’яднацца ўсяму народу, каб не толькі адбудаваць зноў беларускія гарады і вёскі, але і вывесці на высокі сусветны ўзровень эканоміку, прамысловасць, сельскую гаспадарку.

– О, дзякуй, мы зразумелі: “Адзінства” – гэта “union”, “unity”, аб’яднанне, саюз усяго народа для стварэння чагосьці вартаснага, значнага, для развіцця і магутнасці краіны.

Студэнты падзякавалі мне за цікавы аповед, міні-экскурсію па плошчы, сказалі, што ім вельмі камфортана і бяспечна знаходзіцца і вучыцца ў Рэспубліцы Беларусь, што ва ўсім свеце ведаюць пра высокі ўзровень адукацыі і медыцынскага абслугоўвання, пра дасягненні ў прамысловасці і IT-сферы ў Беларусі, а яшчэ пра якасць і разнастайнасць натуральных прадуктаў харчавання.

Я пра ўсё гэта ведала, але мне было вельмі прыемна пачуць такія словы: мяне ахоплівала пачуццё гонару, таму што я таксама “жыву ў Беларусі і тым ганаруся!” З замежнымі студэнтамі я развіталася на алеі гарадоў-пабрацімаў. Выпадкова я пачула размову дзвюх жанчын, якія з цікавасцю чыталі пра далёкія і блізкія гарады, з якімі падтрымлівае разнастайныя сувязі наш абласны цэнтр. Госці з бліжняга замежжа былі прыемна здзіўлены, што ў нашага горада так многа гарадоў-пабрацімаў і што такія шматвектарныя ўзаемасувязі могуць быць паміж прадстаўнікамі нацыянальных культур, паміж людзьмі з розным менталітэтам.

Напрыканцы я падумала, што пра ўсё гэта я і напішу ў сваім сачыненні. Безумоўна, адзінства – гэта адзінства народа, талерантнага, таленавітага, міралюбівага і працавітага. Адзінства праяўляецца ў працы, у вучобе, у развіцці ўсіх сфер, дабрачыннасці, у захаванні гістарычнай памяці і традыцый, у праяўленні актыўнай грамадзянскай пазіцыі. Кожны на сваім месцы павінен адказна і шчыра выконваць сваю справу – гэта яго ўклад у развіццё і моц нашай краіны – квітнеючай Беларусі. “Мы адзіныя ў імкненні жыць на роднай зямлі сваім розумам і працай”, – казаў Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка.